# НУМАРЫ ДЛЯ КАЛЯСАЧНІКАЎ...

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Гэта 18 аб'ектаў сацыяльнай абароны, 89 — аховы здароўя, 472 — адукацыі, 71 — культуры, 21 — фізічнай культуры і спорту. Абсталявана належным чынам таксама 497 крамаў і гандлёвых цэнтраў і 105 цырульняў, рамонтных майстэрняў, фотаатэлье.

Нумары для калясачнікаў з'явіліся ў гасцініцах Вілейкі, Валожына, Салігорска, Дзяржынскага раёна. Летась пачаты рамонтныя работы ў гасцініцы ў Мар'інай Горцы, а на сёлета запланаваны ўвод у эксплуатацыю даступнага гатэля ў Нясвіжы. Мясцовыя ўлады разлічваюць, што за 2017—2019 гады аналагічныя нумары зробяць у Маладзечне, Лагойску, Мядзелі, Стоўбцах, Жодзіне. У будучым інваліды-калясачнікі змогуць спыніцца і ў гасцініцы гарналыжнага цэнтра «Сілічы».

Адаптуецца грамадскі транспарт. На сёння 23 працэнты аўтобусаў абласнога аўтапарка Мінашчыны — нізкападлогавыя. Сёлета набудуць у лізінг яшчэ 32 аналагічныя адзінкі.

Вядома, гэта яшчэ не той вынік, які мусіць быць, прызнае **намеснік старшыні Мінаблвыканкама Віктар СІРЭНКА.** На наступныя пяць гадоў на безбар'ернае асяроддзе выдаткавана амаль 28 мільярдаў недэнамінаваных рублёў са сродкаў абласнога бюджэту. Важна, каб новыя аб'екты будаваліся ў адпаведнасці са стандартамі. «Калі не выкаранім недахопы на этапе праектавання, будзем даганяць бясконца», — заўважыў Віктар Сірэнка.

По словах Наталлі Качанавай, пытанне стварэння безбар'ернага асяроддзя нават не абмяркоўваецца: гэта мусіць быць прадугледжана ў кожным праекце.

— Мясцовыя органы ўлады не павінны даваць слабіны. Ёсць нормы — сачыце, каб яны насамрэч выконваліся. Вось, напрыклад, гэты будынак (Мінская абласная комплексная дзіцяча-юнацкая спартыўная школа «Алімпік-2011». — **Аўт.**) — сучасны, прыгожы, з пандусамі. А выключальні святла знаходзяцца на ўзроўні паднятай рукі здаровага чалавека. І такія недахопы сустракаюцца паўсюдна, — пракаментавала віцэ-прэм'ер.

Не захоўваюцца, напрыклад, нормы пры абазначэнні парковак для інвалідаў. Па правілах, спецыялізаваныя месцы павінны быць на метр шырэйшымі, чым звычайныя (3,5 метра замест 2,5), каб чалавек без праблем мог выбрацца з машыны і перасесці ў каляску. Але часта адзінае, што адрозніває гэтыя паркоўкі, — спецыяльны значок. Варта было б таксама заштрыхоўваць гэты дадатковы метр (так робіцца на Захадзе), каб іншыя кіроўцы не стараліся ўціснуць на шырокае месца яшчэ адну машыну.

Наталля Качанава заўважыла, што пасяджэнні савета

**По словах Наталлі Качанавай, пытанне стварэння безбар'ернага асяроддзя мусіць быць прадугледжана ў кожным праекце.**

нездарма робяцца выязнымі. Адна справа слухаць справаздачы, а іншая — убачыць на месцах, як выконваюцца прынятыя законы.

— Усе мерапрыемствы, якія былі запланаваны дзяржпраграмай па стварэнні безбар'ернага асяроддзя на 2011—2015 гады, былі выкананы, — дадала яна. — Выдаткаваныя сродкі выкарыстаны ў поўным аб'ёме. Але нельга сказаць, што мы ўсё зрабілі, каб людзі з інваліднасцю адчувалі сябе камфортна. Рана самазаспакойвацца. Мы павінны стварыць роўныя ўмовы.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by.*
*г. Маладзечна.*

■ Энергетыка

# СЁЛЕТА ГАЗ ДАРАЖЭЦЬ НЕ БУДЗЕ

**Па словах генеральнага дырэктара Белпалівагаза Леаніда РУДЗІНСКАГА, Беларусь з'яўляецца адной з самых газіфікаваных краін як на постсавецкай прасторы, так і за яе межамі. У краіне сёлета на 1 ліпеня ўзровень газіфікацыі кватэр вырас да 73,9%. Леанід Рудзінскі адзначыў, што ў такіх краінах, як Венесуэла, Калумбія, Расія, дзе ёсць уласны газ, узровень газіфікацыі ніжэйшы, чым у Беларусі. Такому прагрэсу паспрыяла дзяржаўная палітыка, у прыватнасці, дзяржаўная праграма па развіцці вёскі, дзякуючы якой паказчык газіфікацыі сельскай мясцовасці на 1 ліпеня сёлета склаў 33,4%.**

Важным пытаннем для Белпалівагаза з'яўляецца магчымасць зрабіць адзіныя летнія і зімовыя тарыфы на газ. Таксама не выключаецца і больш жорсткая дыферэнцыяцыя тарыфаў у залежнасці ад аб'ёмаў спажывання. Але пра гэта гаворка пойдзе толькі ў 2017 годзе. Леанід Рудзінскі падкрэсліў, што да канца гэтага года цана на газ для насельніцтва павышацца не будзе, індэксацыя тарыфаў таксама не прадугледжана. Акрамя таго, у будучыні магчыма скарачэнне груп насельніцтва, якім прадастаўляецца газ па тарыфах, якія субсідуюцца. Ды і ў цэлым Белпалівагаз разлічвае на поўную ліквідацыю перакрыжаванага субсідавання ў тарыфах на газ. Мерапрыемствы па паступовым зніжэнні перакрыжаванага субсідавання ў газавай галіне цяпер вядуцца. Аднак пра тое, калі гэта адбудзецца, казаць пакуль складана.

Паводле слоў гендырэктара Белпалівагаза, цэны, якія зараз дзейнічаюць на энергарэсурс для насельніцтва, на парадак ніжэйшыя, чым выдаткі. Страты ад забеспячэння газам грамадзян пакрываюцца за кошт адпаведнага павелічэння цэн для юрыдычных асоб, што з'яўляецца праблемным пытаннем для прадпрыемстваў рэальнага сектара эканомікі.

Леанід Рудзінскі нагадаў, што ў сувязі з будаўніцтвам АЭС створана рабочая група па карэкціроўцы дзяржаўных праграм, нарматыўных прававых актаў, якія змяшчаюць палажэнні аб газіфікацыі населеных пунктаў. Яе ўдзельнікі абмяркоўваюць карэкціроўку планаў па электрыфікацыі і газіфікацыі. Адно з пытанняў, што зараз абмяркоўваецца, — пераход на электракатлы, асабліва ў Гродзенскай і Мінскай абласцях. Ужо падрыхтавана праектная дакументацыя па газіфікацыі населеных пунктаў на значную суму, і гэтыя планы будуць выканаліны.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**
Kryzhevich@zviazda.by

■ Абітурыент-2016

# ДАДАТКОВЫ ШАНЦ СТАЦЬ «БЮДЖЭТНІКАМ»

**26 ліпеня ў прыёмных камісіях некаторых ВНУ распачнецца прыём дакументаў ад абітурыентаў у рамках дадатковага набору на бюджэтныя месцы.**

Па стане на 22 ліпеня пра неабходнасць дадатковага набору ўжо праінфармавалі на сваіх сайтах Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт і Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І.П. Шамякіна.

У прыватнасці, на геаграфічным факультэце БДУ на дзённай форме навучання вакантнымі засталіся па два месцы на спецыяльнасцях «геалогія і разведка карысных выкапняў» і «геаінфармацыйныя сістэмы (кірунак — зямельна-кадастравыя)», а на спецыяльнасці «гідраметэаралогія» чакаюць абітурыентаў яшчэ 7 бюджэтных месцаў. На ваенным факультэце на спецыяльнасці «геаінфармацыйныя сістэмы (кірунак — спецыяльныя)» засталіся вакантнымі два месцы.

На завочнай форме навучання на геаграфічным факультэце на спецыяльнасці «геаэкалогія» — 4 вакантныя месцы, на гістарычным факультэце на спецыяльнасці «дакументазнаўства» — 2, у Інстытуце журналістыкі на спецыяльнасці «журналістыка» (кірунак — друкаваныя СМІ)» — 3.

У Мазырскім дзяржаўным педагагічным універсітэце вакантныя месцы ёсць на дзённай бюджэтнай форме навучання на спецыяльнасці «матэматыка і інфарматыка». Падаваць сюды свае дакументы могуць абітурыенты, якія набралі на ЦТ па дзяржаўнай мове не менш як 10 балаў, па матэматыцы — не менш як 15 балаў і па фізіцы — не менш як 10 балаў.

Вакантныя месцы ёсць таксама ў Магілёўскім дзяржаўным універсітэце імя А.А. Куляшова і ў Віцебскім тэхналагічным універсітэце. Больш падрабязная інфармацыя пра дадатковы набор будзе размешчана на сайтах ВНУ да 25 ліпеня ўключна.

Нагадаем, што мінімальныя балы па прадметах ЦТ, з якімі можна будзе паступаць у рамках дадатковага набору, знізіцца не будуць! На вакантныя бюджэтныя месцы могуць прэтэндаваць абітурыенты, якія не прайшлі па конкурсе пры паступленні ў іншыя ВНУ, але маюць на руках патрэбныя сертыфікаты або паступалі на іншыя спецыяльнасці ў тую ж ВНУ.

Акрамя таго, удзельнічаць у конкурсе могуць грамадзяне Украіны, што пражывалі і навучаліся на тэрыторыі Данецкай або Луганскай абласцей, якія прыбылі ў нашу краіну для атрымання дазволу на часовае або пастаяннае пражыванне.

Залічэнне ў рамках дадатковага набору пройдзе па 31 ліпеня.

А ў Міжнародным універсітэце «МІТСО» падаць дакументы на бясплатныя месцы можна да 1 жніўня. Сёлета ва ўніверсітэце прынята рашэнне аб выдзяленні абітурыентам 55 бясплатных месцаў. На іх могуць прэтэндаваць усе, чый сумарны бал не меншы за 300 (тры сертыфікаты ЦТ плюс сярэдні бал атэстата).

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

■ Футбол

## «Вест Хэм» да нас пакуль не прыедзе

**Толькі салігорская каманда не змагла пераадолець другі тур кваліфікацыйнага раўнда Лігі Еўропы і пакідае турнір, «Дынама» і «Тарпеда-БелАЗ» перамаглі і крочаць далей.**

Салігарчане на выездзе саступілі славенскаму «Дамжале» з лікам 1:2 і страцілі магчымасць згуляць у наступным туры з англійскім «Вест Хэмам». Мінскае «Дынама» таксама правяло другі матч у гасцях, але мела большае імкненне да перамогі і ў выніку атрымала яе над ірландскім «Сент-Патрыкам» з мінімальным лікам. У 3-м раўндзе кваліфікацыі Лігі Еўропы мінчане згуляюць з «Ваяводзінай» з Сербіі. Вельмі парадавала сваіх прыхільнікаў жодзінскае «Тарпеда-БелАЗ», якое пасля выязной перамогі над моцным венгерскім «Дэбрэцэнам», атрымала і дамашнюю вікторыю з лікам 1:0. Цяпер тарпедаўцаў чакае яшчэ мацнейшая каманда — венскі «Рапід», які летась не пусціў у групавы раўнд Лігі Еўропы мінскае «Дынама».


Фота БЕЛТА.

Аўтар гола «Тарпеда-БелАЗ» Вадзім Дземідовіч.

**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения** | Капитальное строение, инв. № 401/С-27647 (назначение – здание многоквартирного жилого дома, наименование – многоквартирный жилой дом), площадью 435,7 кв.м, расположенное по адресу: Гродненский р-н, Скидельский с/с, д. Кошубинцы, 73 |
| **Земельный участок, на котором расположен объект** | Кадастровый номер 422088507601000055, (назначение – для обслуживания жилого дома), площадью 0,2500 га, расположенный по адресу: Гродненский р-н, Скидельский с/с, д. Кошубинцы. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельный участок, находящийся в водоохранной зоне водного объекта, код – 4,1, площадью – 0,2500 га; земельный участок, расположенный в охранной зоне линий электропередачи, код – 13,2, площадью – 0,0008 га |
| **Начальная цена продажи** | 9 600 р. (девять тысяч шестьсот рублей) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 480 р. (четыреста восемьдесят рублей) |
| **Условия аукциона** | Без условий |
| **Продавец** | ОАО «Агрокомбинат «Скидельский», 231761, г. Скидель, ул. Промышленная, 1, 8-0152-97-70-90, факс 97-78-68 |
| **Организатор торгов** | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 41-98-34 |
| **Условия оплаты** | По договоренности сторон |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | Р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка 153001739, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 12 августа 2016 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицам – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 28.11.2015 г.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)**

**Последний день приема заявлений – 08 августа 2016 г. до 15.00**

**Телефон для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by/**

П Р И Г Л А Ш Е Н И Е

**Унитарное предприятие Национального олимпийского комитета Республики Беларусь «Спортивно-оздоровительный комплекс «ОЛИМПИЙСКИЙ»**

**проводит аукцион №106 по продаже права заключения договора аренды изолированного нежилого помещения сроком на три года**

| | Предмет аукциона (право заключения договора аренды), цель использования помещения | Площадь, м² | Начальная цена продажи до деноминации | Начальная цена продажи после деноминации |
|---|---|---|---|---|
| | **г. Минск, ул. Сурганова, 2** | | | |
| 1 | Изолированное нежилое помещение № 42 на 1 этаже (под офис) | 31,7 | 1 077 800 | 107,78 |

**Аукцион состоится «24» августа 2016 года в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Сурганова, 2а, конференц-зал. Документы на участие принимаются по «23» августа 2016 года до 17.00 включительно по адресу: 220012, г. Минск, ул. Сурганова, 2а, пом. 2, к. 40.**

Документы, поданные после указанного времени, не рассматриваются. Телефоны для справок: **(017) 290-49-06, 290-47-18, 290-49-11.** Интернет: **www.dvs.by.**

**Организатор аукциона (продавец) – УП «СОК «ОЛИМПИЙСКИЙ», г. Минск, ул. Сурганова, 2а, пом. 2, к. 40.**

Для участия в аукционе участник перечисляет задаток в размере 10 процентов от начальной цены заявленного лота на **расчетный счет 3012208250015, ОАО «Белагропромбанк», 220036, г. Минск, пр-т Жукова, 3, МФО 153001964, УНП 101 508 270, УП «СОК «ОЛИМПИЙСКИЙ».** Перечень и порядок подачи документов для участия в аукционе определены Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды зданий, сооружений и помещений, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 г. № 1049.

Оплата за право заключения договора аренды осуществляется победителем аукциона разовым платежом на расчетный счет организатора аукциона в течение 3 рабочих дней со дня его проведения.

Победитель аукциона в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан возместить УП «СОК «ОЛИМПИЙСКИЙ» затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом аукциона. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) приобретает право заключения договора аренды после оплаты стоимости предмета аукциона и возмещения затрат на организацию и проведение аукциона.